Шыфр:_______________________ Зацвярджаю

Колькасць балаў:______________ Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта намеснік Міністра адукацыі

Месца:_______________________ _______________Р.С. Сідарэнка

«06» ____03________2015 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Мінск, 2015 г.*

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** «Пазнайце» запазычаныя словы па лексічных значэннях і даведках аб паходжанні. Упішыце словы ў табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*
(1 бал – за кожнае правільна запісанае слова;
0,5 бала – калі ў слове дапушчана арфаграфічная памылка)

| Значэнне слова | Даведка аб паходжанні | Слова-адказ |
|---|---|---|
| 1. Асоба, якая садзейнічае арганізацыі якіх-небудзь мерапрыемстваў (спартыўных спаборніцтваў, здымак фільма і пад.) шляхам прыцягнення інвестараў і спонсараў. 2. Спецыяліст у камерцыйных фірмах, які спрыяе прасоўванню выробленага фірмай тавару на рынак, а таксама прыцягненню інвестараў і спонсараў. | англ. *promoter* | |
| Распрацоўшчык, складальнік аб'яў, рэкламных тэкстаў і слоганаў. | англ. *copywriter* | |
| Парода пакаёвых дэкаратыўных сабак з доўгай мяккай шэрсцю і пляскатым шырокім носам; сабака такой пароды. | англ. *pekinese* (*pekingese*) | |

| | | |
|---|---|---|
| Малабюджэтнае элітарнае кіно. | англ. *art house*, ад *art* – мастацтва і *house* – дом | |
| Музыка да фільма. | англ. *soundtrack* | |

**Заданне 2.** У кожным сказе выберыце з дужак слова, якое падыходзіць па сэнсе, падкрэсліце яго. Свой выбар абгрунтуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(0,5 бала – за кожнае правільна падкрэсленае слова,
0,5 бала – за абгрунтаванне)

1. Назаўтра быў я ў (**гумары / гуморы**), не скрэблі кошкі грудзі мне (*А. Вярцінскі*).

АБГРУНТАВАННЕ:

2. Я пайшоў дадому (**вераснёваю / верасоваю**) пусткаю (*У. Караткевіч*).

АБГРУНТАВАННЕ:

3. Міколка ўжо не крычаў. У яго хапіла (**згадкі / здагадкі**) узяцца за другое – выліваць з чаўна ваду (*А. Чарнышэвіч*).

АБГРУНТАВАННЕ:

4. Ладынін колькі разоў прасіў калгаснікаў не курыць, але просьбы яго былі (**дармавыя / дарэмныя**)… (*І. Шамякін*).

АБГРУНТАВАННЕ:

5. Ад гулу машын, што прайшлі наперад, з вяршалін зляталі снегавыя (**бліскавіцы / бліскаўкі**), церушыліся з галін, і ў халодным паветры вісела рэдкая тканіна намаразі (*А. Савіцкі*).

АБГРУНТАВАННЕ:

**Заданне 3.** Паходжанне якіх фразеалагізмаў раскрываецца ў наступных тэкстах? Запішыце фразеалагізмы.

*Максімальная колькасць балаў – 6*
(2 балы – за кожны правільна вызначаны фразеалагізм)

1. Узнікненне фразеалагізма, які мае значэнне 'адкладваць рашэнне чаго-небудзь (справы, просьбы, заявы), пакідаць без увагі, без руху', звязана з традыцыямі даўнейшай

судовай практыкі. Тыя ці іншыя заявы, прашэнні знарок адкладваліся на доўгі час пад сукно, якім засцілаўся службовы стол чыноўніка.

**Адказ 1:** фразеалагізм ______________________________________________

2. Фразеалагізм, што мае значэнне 'чалавек, на якога звальваюць чужую віну, адказнасць за іншых', запазычаны з царкоўнаславянскай мовы. У Бібліі расказваецца пра старажытнаяўрэйскі абрад: адзін раз у год, у дзень адпушчэння грахоў, прыводзілі ў пэўнае месца казла, і на яго галаву вярхоўны жрэц ускладваў абедзве рукі, што сімвалізавала перакладанне грахоў усяго народа на казла, якога пасля праганялі («адпускалі») у пустыню.

**Адказ 2:** фразеалагізм ______________________________________________

3. Паходжанне фразеалагізма, які мае значэнне 'цішком падстроіць непрыемнасць, подласць', звязана з тым, што даўней татары і іншыя магаметане не елі свініны. І калі хто-небудзь за сталом падкладваў ім свіное мяса, то гэта было для іх вялікай непрыемнасцю.

**Адказ 3:** фразеалагізм ______________________________________________

**Заданне 4.** Вызначце, як утварыліся аўтарскія наватворы.

*Максімальная колькасць балаў – 4*
(0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову,
0,5 бала за кожны правільна вызначаны спосаб утварэння).

1. З асмужаных прастораў Беларусі глядзім мы ўсе ў касмічны *недасяг* (У. Верамейчык).
2. Бясконцасць *векавечыцца* ў жыцці. Бяздомна ісціна блукае ў свеце (Р. Барадулін).
3. Імгненне, прашу, спыніся, вярні *месяцовасць* мрой… (В. Максімовіч).
4. Даваў дзвярам прастор, заходзіў нечакана *з'інелабровы* бор, пілой падпеaразаны (Р. Барадулін).

| **Аўтарскі наватвор** | **Утваральная аснова** | **Спосаб словаўтварэння** |
|---|---|---|
| **Узор:** *скурганіць* | *курган* (□) | *прыставачна-суфіксальны:* с-курган + і(ць) |
| *недасяг* | | |
| *векавечыцца* | | |
| *месяцовасць* | | |
| *з'інелабровы* | | |

**Заданне 5.** Запішыце колькасна-іменныя спалучэнні паводле прапанаванага ўзору.

**Узор:** 1 пуд = 16,38 + кілаграм: *1 пуд роўны шаснаццаці цэлым трыццаці васьмі сотым кілаграма.*

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал за кожнае правільна запісанае колькасна-іменнае спалучэнне).

| **Лік** | **Колькасна-іменнае спалучэнне** |
|---|---|
| 1 палушка = 1/4 + капейка | |

| | |
|---|---|
| 1 рубель = 200 + грош | |
| 1 залатоўка = 1.5 + грыўня | |
| 1 алтын = 0, 03 + рубель | |
| 1 талер = 92,62 + капейка | |

**Заданне 6.** Запішыце па-беларуску.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(1 бал за кожны правільны адказ).

1) удивляться неизвестному – ______________________________;
2) заниматься согласно расписанию – ______________________________;
3) ухаживать за девушкой – ______________________________;
4) по случаю встречи – ______________________________;
5) не выучить из-за болезни – ______________________________;

**Заданне 7.** У вучэбным дапаможніку «Беларуская мова» для 11 класа сфармуляваны пунктуацыйныя правілы, паводле якіх дапасаваныя азначэнні на пісьме выдзяляюцца коскамі. Запішыце гэтыя правілы, праілюструйце іх прыкладамі.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Коскамі выдзяляюцца дапасаваныя азначэнні, калі яны:

1. ______________________________

2. ______________________________

3. ______________________________

4. ______________________________

***

*Васілю Быкаву*

Таварыш маёр запасу,
Дазвольце звярнуцца да вас…
Вы лічыце за абразу
Сябе выстаўляць напаказ
    Землятрасенне нібыта –
    Гарматаў пагрозлівы рык…
    Як рэквіем
        па забітых –
    Журботны
        жураўліны крык…
І вылазка на край свету,
Да ворагаў па языка,
Дзе ўспышка трэцяй ракеты,
Як здрадлівы ўсплеск цесака.
    Калі дажыць да світання,
    Калі пратрымацца да дня,
    Дык могілкамі
        не стане
    Праклятая вышыня.
Такое трэба сумленне
І сціпласць суровую мець,
Як тое паведамленне
Пра вашу заўчасную смерць.
    Даўно пад Кіраваградам
    Пастаўлены вам абеліск…
    Што вы – жывы – мы ўсе рады!..
    Паколькі мёртвым не баліць, –
    Ад іх імя
        парой мірнай,
    Прыклаўшы да брыля руку,
    Навыцяжку стаўшы смірна,
    Як належыць франтавіку,
    Вам чэсць аддае з пашанай
    Ўваскросшы з мёртвых,
                жывы,
    Без вестак прапаўшы рана
    Гвардыі радавы.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

5.

**Заданне 8.** З якімі літаратурна-мастацкімі напрамкамі звязаны прыведзеныя імёны, творы і гісторыка-культурныя рэаліі?

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| **Імёны, гісторыка-культурныя рэаліі** | **Літаратурна-мастацкі напрамак** |
|---|---|
| Сімяон Полацкі, браты Зізаніі; "Рыфмалагіён, альбо Вершаслоў"; сінтэз сярэдневяковых і рэнесансных традыцый; адлюстраванне ўнутрана супярэчлівага чалавека; палемічная літаратура; з'яўленне школьнага тэатра | |
| Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч; "Ідылія", "Гапон"; адлюстраванне пачуццяў, настрояў, перажыванняў чалавека; паказ багатага духоўнага свету простага чалавека | |
| Адам Міцкевіч, Максім Багдановіч; "Вечарніцы", "Шляхціц Завальня", "Магіла льва"; адлюстраванне выключнай асобы, героя-бунтара; адстойванне нацыянальных традыцый, мовы, культуры | |
| Адам Нарушэвіч, Юльян Урсын Нямцэвіч; "Пра дасканалую паэзію, або Вергілій і Гамер"; падзел на "высокія" і "нізкія" жанры ў літаратуры; праявы ў беларускай літаратуры праз парадыраванне гэтага напрамку ("Энеіда навыварат"), захаванне ў драматургічных творах адзінства дзеяння, часу і месца | |

**Заданне 9.** Назвы якіх аповесцяў і раманаў Васіля Быкава "ўплецены" ў верш Міколы Аўрамчыка?

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 10.** Прачытайце верш Ніла Гілевіча і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Паэт і фізік-атамнік у нечым
Усё-такі падобны між сабою.
Душа паэта – то ж рэактар вечны,
Што выпраменьвае часціцы болю
І сотні тысяч сэрцаў чалавечых
Бамбардзіруе імі без адбою,
Каб шляхам ядзернага расшчаплення
*Прывесці ў рух энергію сумлення.*

| | |
|---|---|
| 1. Якая цвёрдая форма верша выкарыстана паэтам? | |
| 2. Да якой разнавіднасці лірыкі можна аднесці гэты твор? | |
| 3. Вершаваны памер першых чатырох радкоў | |
| 4. Які тып рыфмоўкі ў першых чатырох радках? | |
| 5. Які сродак мастацкай выразнасці выкарыстаны ў вылучаным курсівам фрагменце? | |